фалькloры Беларусі 17—18 ст. З А. выступалі шкаляры ў час свят (*Каляды, Вялікдзень* і ў сувязі з заканчэннем навучальнага года, каб прадэманстраваць веды па рыторыцы, уменне прыгожа гаварыць. Выкарыстоўваліся на сейміках, як прамовы *свата* на *вяселлях*. Найбольш цікавыя польска-бел. А. створаны ў 1750—60-я г. ў Жыровіцкай базыльянскай школе (Слонімскі раён), у 1780-я г. ў Забельскай дамініканскай калегіі (Верхнядзвінскі раён). Лепшыя фалькларызаваліся, распаўсюджваліся ў рукапісных зборніках, завучваліся на памяць.

**АРЖАВЕ́НЬ**, а р ж а в е н н і к, міфалагічная істота, нячысцік, які жыве ў аржавеннях — багністых мясцінах, пакрытых іржою. Уяўляўся брудна-рудым, пакрытым іржавымі прыліпамі, з надзвычай тоўстым жыватом і тонкімі, як сцябліна хвашча, нагамі. Увесь час ён рыгае і выклікае агіду ва ўсіх нячысцікаў і ў жывых істот. Рэдкаю яго здабычай можа стаць жывёла, якая, ратуючыся ад драпежнікаў, забягае ў балота, альбо чалавек, што зайшоў у глуш у ненармальным стане. А. спакайнейшы за сваіх братоў — *Багніка* і *Балотніка*. Нават узімку А. не ўдаецца закрыць свайго сарамотнага жытла — буражоўтыя плямы з-пад снегу і лёду выдаюць яго знаходжанне. Лета не высушвае аржавенні, а людзям непатрэбна неўрадлівая зямля, і нячысцік, лежачы на дне, абрастае ліпучымі слаямі і падтрымлівае каламуць у аржавенні.

*Літ.*: Н и к и ф о р о в с к и й Н.Я. Нечистики, свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе. Витебск, 1995.

*У. А. Васілевіч.*

**АРКЕ́СТР НАРО́ДНЫХ ІНСТРУМЕ́НТАЎ**, разнавіднасць аркестра, у склад якога ўваходзяць музыканты, якія іграюць на аўтэнтычных або рэканструяваных нар. музычных інструментах пад кіраўніцтвам дырыжора, дзе асноўныя аркестравыя партыі выконваюцца некалькімі музыкантамі ва унісон. З'яўленне першага на Беларусі А.н.і. звязана з імем Дз.Захара (аркестр бел. нар. інструментаў, 1928). З 1930 афіцыйна зацверджана стварэнне Бел. дзяржаўнага ансамбля нар. інструментаў, у 1937 пераўтвораны ў Аркестр бел. нар. інструментаў (цяпер Нац. акадэмічны нар. аркестр Рэспублікі Беларусь імя І.Жыновіча). На Беларусі існуюць некалькі відаў А.н.і.: бел. нар. інструментаў (цымбальны), рускіх нар. інструментаў (домбрава-балалаечны), баянаў і акардэонаў, фалькл. (уваходзяць *цымбалы, дудка, жалейка*, ліра, *скрыпка, гармонік*) і змешанага складаў. Прафесіяналізацыя А.н.і. абумовіла ўдасканаленне аркестравых інструментаў і ўтварэнне іх сем'яў на ўзор сімфанічнага (напрыклад, групы цымбалаў, домбраў, балалаек, баянаў, дудак). Рэпертуар аркестра складаецца з пералажэнняў сімфанічнай музыкі, апрацовак нар. песень і танцаў, інструментовак і арыгінальных твораў бел. і замежных кампазітараў.

*С. С. Авадок.*

**АРЛО́Ў** Уладзімір Аляксеевіч (н. 25.8. 1953, г. Полацк), пісьменнік. Скончыў БДУ (1975). Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1986. Адным з найбольш пашыраных у яго творах вобразаў, якія генетычна звязаны з фалькл. паэтыкай, з'яўляецца ўвасабленне. У празаічных і паэтычных творах А. даволі часта можна сустрэць вобраз своеасаблівага пярэвараtня, істоты, якая спалучае ў сабе чалавечую свядомасць з прыкметамі і ўласцівасцямі жывёл, птушак, нават неадушаўлёных прадметаў. Герой апавядання «Палёты самотнага птаха», выходзячы на балкон, ператвараецца ў грака і набывае здольнасць лятаць. Пры гэтым ён адчувае пэўную дыстанцыю ў адносінах да сябе з боку інш. птушак. Такімі ж ізгоямі і ў свеце людзей, і ў свеце птушак паўстаюць чалавекаптушкі з верша з аднайменнай назвай. Прыём адухаўлення выкарыстоўваецца ў апавяданні «Маналог святога Пётры», дзе аповед вядзецца скульптурай святога. Як жывая істота, надзеленая адчуваннямі і ўспрыманнямі, паказваецца дрэва ў апавяданні «Клён». Фалькл. прыёмы пераносяцца аўтарам у сучасны літаратурны кантэкст, набываючы пры гэтым новыя семантыка-стылістычныя і функцыянальныя значэнні. Выяўляючы ўнутраны свет сваіх герояў, А. паказвае сувязь іх светапогляду з вобразамі-архетыпамі міфалагічнага мыслення. Вялікае месца ў свядомасці герояў А. займаюць багі славянскай міфалогіі Стрыбог, Пярун, Жыва і інш. Пра абрады і павер'і старажытных беларусаў, іх сувязь з язычніцтвам расказваецца ў апавяданні «Пішу вам у Масковію» і інш. У празаічных творах А. гістарызмы